**Дыдактычны матэрыял выкарыстання інтэрактыўных метадаў і прыёмаў у 5–7-х класах на ўроках беларускай літаратуры**

| Клас | Тэма | Прыём |
|---|---|---|
| 5-ы клас | Уладзімір Караткевіч.<br>“Бацькаўшчына” | ***“Асацыятыўнае кола”***<br>*Мэта:* развіваць асацыятыўнае ўяўленне вучняў.<br>На этапе матывацыі прапануецца вучням назваць словы-асацыяцыі, якія ўзнікаюць са словам “Бацькаўшчына”:<br><br>*(Радзіма, родны край, Беларусь, чысціня, азёры, Гродна і інш.)* |
| 5-ы клас | Падагульняльны ўрок па раздзеле “За смугою стагоддзяў | ***“Блытаніна”***<br>*Мэта:* замацаваць асноўныя паняцці раздзела.<br>З літар скласці вывучаныя тэрміны:<br>1. ГАКАЗДА (*Загадка*)<br>2. АНЕЛДЕГ (*Легенда*)<br>3. КТЫРАМПЕ (*Прыкмета*)<br>4. ГАКАДАД (*Адгадка*)<br>5. АЗКРЫПАК (*Прыказка*) |
| 5-ы клас | Генрых Далідовіч.<br>“Страта” | ***“Чорная скрынка”***<br>*Мэта:* развіваць вобразнае ўспрыманне.<br>Па апісанні вызначыць, які прадмет знаходзіцца ў “чорнай скрынцы”:<br>1) гэты прадмет жаўтаватага колеру;<br>2) Стась упершыню ўбачыў яго ў доме Міці;<br>3) мама Міці частавала хлопчыкаў гэтай садавінай (*апельсін*). |

<table>
<tr><td>5-ы клас</td><td>Падагульненне<br>і сістэматызацыя<br>вывучанага за год</td><td>“Літаратурныя ўраўненні”<br>Літаратурныя ўраўненні заснаваны на прынцыпах рашэння матэматычных ураўненняў, дзе ёсць адно або два невядомыя, якія, абапіраючыся на веды, варта знайсці.<br>Мэта: праверыць у вучняў веданне твораў і іх герояў.<br>Назваць героя / твор на месцы пытальніка:<br>а) “У старых дубах” = Грышка + ? (Базыль);<br>б) ? = ? + Васілёк + Барына (“Ля вогнішч начлежных”, Галіна);<br>в) “Страта” = Міця Бокуць + ? (Стась);<br>г) ? = Кастусь + дзед Агей (“Цітаўкі”).</td></tr>
<tr><td>6-ы клас</td><td>Алесь Пісьмянкоў.<br>“Продкі”</td><td>“SMS-пасланне”<br>Мэта: прааналізаваць свае адносіны да ўрока<br>“Адправіць” пасланне свайму сябру або сяброўцы, расказаўшы ім пра ўрок, ураженні ад яго.<br>
</td></tr>
<tr><td>6-ы клас</td><td>Пятрусь Броўка.<br>“Зямля Беларусі”<br>(урывак з паэмы<br>“Беларусь”)</td><td>“Расшыфроўшчыкі”<br>Мэта: зацікавіць вучняў тэмай урока праз зашыфраванае слова.<br>Расшыфраваць назву твора. Кожная лічба адпавядае парадкаваму нумару літары ў алфавіце:<br><table><tr><td>9</td><td>32</td><td>14</td><td>13</td><td>32</td></tr></table><br><table><tr><td>2</td><td>6</td><td>13</td><td>1</td><td>18</td><td>21</td><td>19</td><td>10</td></tr></table>(“Зямля Беларусі”)</td></tr>
<tr><td>6-ы клас</td><td>Міфы пра духаў</td><td>“Паштальёны”<br>Мэта: замацаваць веды пра міфічных істот (духаў), што бытуюць у беларускім фальклоры, пра іх звычаі, схільнасці, характары.<br>Неабходна разнесці “пошту” (характарыстыка духаў) па “хатках” (назвы духаў):<br><u>Характарыстыка духаў:</u></td></tr>
</table>

<table>
<tr>
<td></td>
<td></td>
<td>падтрымліваў агонь у печы; ірваў рыбацкія сеткі; хаваўся на ўзгорку, ля каменя, куста ці ў канаўцы; часта чапляецца за кустоўе і дрэвы; любіў палохаць людзей; баяўся макрэчы; заплятаў коням грывы; падпільноўваў тых, хто купаўся, каб у любы момант забраць да сябе; яму прыслужваюць вятры; казытаў ці шчыпаў уночы соннага; часта здзекаваўся з чалавека, прымушаў яго доўга блукаць на адным месцы; толькі як сядзе сонца, пачынаў сваволіць.<br><br></td>
</tr>
<tr>
<td>7-ы клас</td>
<td>Якуб Колас.<br>“Дзядзька-кухар”<br>(урывак з паэмы “Новая зямля”)</td>
<td>“Пазлы”<br>Мэта: праверыць разуменне вучнямі выкарыстаных у творы фразеалагізмаў.<br>Урывак багаты на выкарыстанне фразеалагізмаў. Якое значэнне адпавядае наступным фразеалагізмам? Неабходна суаднесці левы слупок з правым:<br>
<table>
<tr><td>(майстар) на ўсе рукі</td><td>‘што-н. зусім знікла, прапала, прайшло’;</td></tr>
<tr><td>на кукішках (сядзець)</td><td>‘асцярожна намякаць на што-н., каб высветліць абставіны, выведаць шо-н.’;</td></tr>
<tr><td>на руках насілі</td><td>‘выключны, здольны на вельмі многае, здатны да ўсяго’;</td></tr>
<tr><td>збіліся з тропу</td><td>‘зусім малы, малалетні’;</td></tr>
<tr><td>вуды закідае</td><td>‘сагнуўшы ногі ў каленях і трымаючыся на насках’;</td></tr>
<tr><td>хадзіць пяшком пад стол</td><td>‘высока цаніць каго-н., даражыць кім-н.’;</td></tr>
<tr><td>як рукою знімала</td><td>‘даходзіць да замяшання, разгубленасці; заблытвацца’.</td></tr>
</table>
</td>
</tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| 7-ы клас | Змітрок Бядуля.<br>“На Каляды к сыну” | ***“Веру – не веру”***<br>*Мэта:* праверыць веданне зместу твора.<br>Ці верыце вы, што… (З.Бядуля “На Каляды к сыну”. Вобраз Лаўрука) (7-ы клас):<br>1) Лаўрук пашкадуе маці.<br>2) У Лаўрука проста не было часу наведаць Тэклю.<br>3) Лаўрук не хоча, каб ведалі пра яго бедную старую маці.<br>4) Лаўрук пазнаў у старой жанчыне сваю маці.<br>5) Лаўрук – добры і клапатлівы сын. *(так – 3, 4; не – 1, 2, 5)*. |
| 7-ы клас | Уладзімір Караткевіч.<br>“Зямля пад белымі крыламі” | ***“Лічбавы ланцужок”***<br>*Мэта*: узнавіць змест твора па ключавых пытаннях.<br>Неабходна скласці лічбавы ланцужок. Правільныя сцвярджэнні абазначаюцца знакам лічбай 1, няправільныя – 0.<br>1) Беларус любіць белы хлеб.<br>2) Св.Юры і св.Мікалай карысталіся асаблівым поспехам ў беларусаў.<br>3) “Своеасаблівая падліва з мяса, рабрынак і сала, падбоўтаная мукой, у якою “мачаюць” бліны”, – гэта мачанка.<br>4) Квас і бярозавік – нацыянальныя беларускія напоі.<br>5) “Крытае памяшканне, з трох бакоў запушчанае сценкамі” – гэта хлеў.<br>6) Рыс – гэта другі хлеб беларусаў.<br>7) “Лоша” па-літоўску – стронга.<br>8) У.Караткевіч згадвае возера Нарач, апетае А.Міцкевічам?<br>9) Дуб – “дрэва вечнасці”.<br>10) “Два гаршкі, злучаныя ручкай, каб насіць на поле абед” – гэта спарышы.<br>*Адказы: 0111001011.* |